■ Важныя ўрокі

# КАБ НЕ ПРАСЛЫЦЬ «БРОНЯЮ»

**— Хадзі да мяне, дачушка, я табе зараз торбачку маленькую пашыю з ручкай і кішэнькай. Паглядзі, які прыгожы кавалачак тканіны ў мяне ёсць. Будзеш у сваю тарбінку цацкі, лялькі складваць. У хлопцаў такой не будзе, — маці падхапіла на рукі Дарынку, прыціснула да сябе, пасадзіла на калені, пацалавала за вушкам і стала гушкаць. А Дарынка ўжо і забылася, што збіралася разам з братамі па ўюны, яна заюшылася-захапілася мацерыным шытвом абноўкі-торбачкі. У яе сяброўкі Галькі такой сумачкі і блізка не будзе, дзе яна яе возьме? Яе ж маці не шые так, як Дарынчына.**

Дарынчына маці абшывае ўсю сям'ю, ды яшчэ і заказы бярэ для людзей. Вырабы з-пад яе спрытных рук выходзяць розныя. Для суседак яна ладзіць сукенкі, кофты, камізэлькі, спадніцы, фартухі, а для сваіх сыноў — шаравары і футболкі з кішэнямі на замочках, кепкі-васьміклінкі. Бацьку маці шые толькі споднюю бялізну, бо ён жа атрымлівае на сваёй рабоце форменную адзежу з бліскучымі гузікамі. Дарынка са старэйшай сястрой ходзяць таксама ва ўсім мацерыным шытве. Сястры, якая старэйшая за Дарынку аж на дванаццаць гадоў, маці пашыла нават пінжачок з кішэнямі. Доўга марудзіла з ім, бо шыла з самай сапраўднай падкладкай — сацінавай. Дарынка навучылася адрозніваць матэрыял — яна ведае ўжо, дзе паркаль і сацін, а дзе байка і мультан, корт, чартакож або сукно, а дзе самыя далікатныя і дарагія: крэп-жаржэт, пан-бархат, шоўк.

Сярод заказчыц маці ёсць і модніцы з іншых вуліц пасёлка. Тыя прыносяць швачцы часопісы з модамі або толькі каляровыя абгорткі ад іх. Там змешчаны прыгожыя жанчыны ў незвычайных сукенках з крэп-жаржэта, пан-бархату, шоўку. Тыя модныя ўбранкі маці шые-марудзіць даўжэй, чым звычайныя — простыя. Бывае, пакрыквае на Дарынку, каб не кранала іх — «крый божа» — рукамі, бо будуць плямы. А ёй так хочацца пагладзіць той пан-бархат, а яшчэ і выпрасіць у мацеры кавалачкі на сукенкі для сваіх лялек. Але ёй дастаюцца такія малюсенькія абрэзкі-стонжкі, што яна ледзь не плача. Ды яшчэ маці сурова выгаворвае, што і так ледзь хапае тканіны і кавалачкі трэба аддаваць заказчыцам. А Дарынка не разумее: ну навошта тым модніцам абрэзкі — яны што, таксама ў лялькі гуляюць?

— Дурненькая мая, а як плацце возьме ды парвецца, яе ж той жа тканінай накрапіць патрэбна, каб не так відаць было, — выгаворвае маці малой дачцэ, лоўка шчоўкаючы вялікімі чорнымі кравецкімі нажніцамі, адразаючы па выкрайцы з газеты новы кавалак тканіны.

Мерна стракоча нажная швейная машынка, якая стаіць перад акном, — каб было відаць Дарынчынай маці. Сама Дарынка сядзіць тут жа побач у куце пад самаробнай вешалкай на кажусе, пакрытым саматканай посцілкай, і гуляе ў лялькі. У яе распараджэнні малыя абрэзкі-стужкі рознай тканіны ад мацерыных заказаў. Старэйшая сястрычка навучыла Дарынку рабіць з іх лялькі. Дзяўчо сваіх лялек увесь час пераапранае, корміць, гушкае і складвае ў плеценую з тонкіх лазовых пруткоў калыску. Мацвей пастараўся для яе. Калыска такая лоўкая, як самая сапраўдная, толькі маленькая. Сярэдні брат Дарынкі Мацвей здольны рабіць і не такія штукі. Дарынка задаецца калыскай перад сяброўкамі па вуліцы — Галькай і Волькай, — у іх браты такой век не змайструюць, бо толькі тое і робяць, што галёкаюць ды б'юцца адзін з адным, — то за нейкую бляшанку, то за сцізорык, а то проста так. «Лепш заняліся б якой справай, як мае браты», — думае Дарынка ў сваім куце.

Дарынка таксама навучыцца шыць. А куды дзенецца? Вунь жа хлопцы навучыліся ўсё рабіць так, як іхні бацька. А маці навучыла шыць старэйшую Дарынчыну сястру. Анюта ўжо ўмее састрачыць навалачкі, сфастрыгаваць сукенку, падшыць падол або калашыны штаноў. Яна шые яшчэ не так, як маці, але то ж — маці! З ёй — ніхто не параўнаецца! Яна — самая лепшая на свеце швачка! Дарынка, як вырасце, будзе такой жа. Яна будзе радая, што яе дачка не якая-небудзь «няраха-нецюпаха», як тая Броня са станцыі, якая не можа зашыць рубец ды яшчэ сукенку носіць на два бакі.

— Не будзь Броняю, а то ні адзін хлопец на цябе не гляне і куры засмяюць, — кажа маці Дарынцы, калі яна каназіцца і не хоча вось зараз жа памяняць сукенку на чыстую, бо вельмі занялася шытвом новай адзежы для сваёй новай лялькі. Маці збірае брудную бялізну для замочвання і прання.

Броня — адна з заказчыц. Смешная такая. Дарынка запомніла, як яна прыйшла да іх першы раз. Назвалася Броняй. Яе прыслалі на іхнюю станцыю працаваць дзяжурнай. Родам аказалася з-пад Калінкавіч. У пристанцыйнай казарме ёй выдзелілі пакой. Распытала пра ўсё гэта маці новую заказчыцу — і давай прымерку рабіць маладзіцы. Мерала, мерала, круціла тую Броню так і гэтак, потым не вытрымала і кажа:



Малюнак мастачкі Ганны СІЛІВОНЧЫК.

— Ці я сляпая стала, ці мо мне здаецца: што ета за плацце на табе, дзеўка? Спераду чыстае, а ззаду — нейкае замурзанае. Ты яго перадам назад надзела, ці што? І вытачкі ззаду, як наперадзе, і кішэні-падманы такія ж?

А тая ў адказ рагоча:

— Ето ж, цётка Прохараўна, у мяне плацце на два бакі. Я так усё нашу: замурзаю перад, дык назад яго надзяваю, каб не відно было, а калі ўжо і ззаду замурзаю, тады — няма куды дзявацца — мыю.

Паглядзела Дарынчына маці на сваю новую заказчыцу, як на малахольную якую, і пытае:

— Дык і як табе шыць?

— А шыйце мне, Прохаравенька, двухбаковае плацце — з двума перадамі. Пашыеце етае, я шчэ прынясу тканіны — крэп-жаржэту, на выхадное. І яго мне пашыеце на два бакі, бо як жа мыць яго — злезе-паліняе ўвесь фасон.

Ведама, маці расказала пра «плацце на два бакі» іншым сваім кліенткам. І пайшла па пасёлку гуляць плётка-забаўка пра Броню і яе незвычайныя ўбранкі. Мала таго, дык дзяўчат, якія былі не вельмі акуратнымі ў адзенні і ў якіх у хаце не «зіхацела» ад чысціні, сталі зваць за вочы «бронямі». А пра хлопцаў-кавалераў, якія заляцаліся да іх, потым жаніліся, казалі: «Вось адхапіў сабе броню, дык адхапіў».

Каб не праслыць «броняю», Дарынка кідае свае забаўкі і бяжыць мяняць сукенку.

**Раіса ДЗЕЙКУН**

■

■ Маміны дзённікі

## ВОСЬ ДЫК СЮРПРЫЗ!

**— Да кацянят паедзем? — пытаецца сын перад выхаднымі.**

**— А ты думаеш, яны цябе яшчэ не забылі?**

**— Вядома! Яны ж памятаюць сваё дзяцінства!**

☺☺☺

Вывучаем з сынам тэму «Свойскія жывёлы».

— Якую карысць яны прыносяць? — пытаюся ў Дані.

— Кот ловіць мышэй, карова дае малако, свіння... прыносіць сама сябе.

☺☺☺

**Ляжалі ў бальніцы з алергіяй. Чамусьці прыйшлося зрабіць малому два ўколы.**

**— Два ўколы, цэлыя два ўколы! — абураўся сын. — Вось дык сюрпрыз! Ніякай павагі да мяне!**

☺☺☺

— Каго ты запросіш на дзень нараджэння? — пытаюся ў сына.

— Майго сябра Міцю.

— І ўсё?

— Так, аднаго хопіць, бо інакш мы можам усю кватэру «разнесці».

☺☺☺

**Даню ў бальніцы трэба было зрабіць укол.**

**— Пазавіце яшчэ адну медсястру, — кажу я, бо ведаю, што сын моцна вырываецца, калі робяць укол.**

**Даня, гледзячы на абедзвюх медсясцёр:**

**— Вы і ўдзвюх са мной не справіцеся!**

☺☺☺

Пасля таго як дзядуля, нагуляўшыся з малым, паехаў дадому, Даня рэзюмаваў:

— Шкада, што ў Вовы так хутка энергія заканчваецца.

☺☺☺

**— Мама, такіх сюрпрызаў, як я, ніхто з дзяцей сваім мамам не робіць, — загадкава кажа сын.**

**— Ты пра што?**

**— Я сам апрануўся!**

☺☺☺

Пасля прагляду кулінарнай перадачы Даня гуляе са сваім «пластылінавым» цестам:

— Каб цеста «дыхала», я зраблю ў ім дзіркі...

**Запісала Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ**

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# МАКАРАВЫ РАСКАЗЫ



**На гэтай картачцы мой дзядуля Макар Максімавіч Мартынчук. Ён нарадзіўся больш за сто дваццаць гадоў таму ў вёсцы Дзямідаўшчына Кобрынскага раёна (былога Антопальскага).**

У 1914 годзе сям'ю Мартынчукоў прымусілі выехаць за раку Волгу пад Урал. Там Макар з татачкам і братамі пабудавалі вадзяны млын. І маволі людзям зерне на муку.

Малодшы брат Макара — Раман, які служыў у Чалябінску камісарам, пераканаў яго пайсці служыць у войска маршала Блюхера. Так мой дзядуля здзейсніў знакаміты Уральскі пераход — за яго палкаводзец Блюхер быў узнагароджаны першым ордэнам Рэспублікі Саветаў. А Макар атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі на 50-годдзе рэвалюцыі ў 1967 годзе.

Пасля рэвалюцыі мой дзядуля з сям'ёй вярнуўся на радзіму. Калі прыехаў, убачыў жахлівае відовішча: паўсюдна панаваў галадамор. Жыхары вёскі Дзямідаўшчына ляжалі мёртвыя ў хатах, на ганках, на вуліцы, у полі... Не было нават каму іх пахаваць. Макар з татам, братамі ды іншымі прыезджымі выкапалі магілкі для ўсіх нябожчыкаў.

Неўзабаве дзядуля ажаніўся са Сцепанідзіяй Багічук (бацька якой — Якуб — сваім возам падвозіў снарады на фронт). Ёсці не было чаго, людзі пухлі ад голаду. Аднаго дня, на шчасце, прыехалі амерыканскія паненкі. Паставілі паходную кухню. Яны не ў сілах былі накарміць усіх вяскоўцаў: не хапала ежы. Таму кармілі толькі будучыню нацыі, дзяцей да 16 гадоў. Дзядуля Макар наўмысна паменшыў узрост сваёй жонкі. І яна харчавалася са сваёй малодшай сястрой Ганнай. Толькі дзякуючы амерыканскім харчам мая бабуля змагла выжыць.

Хату, якую вы бачыце на фотаздымку, дзядуля пабудаваў сваімі рукамі ў 1920 годзе. Пасля прыезду з Расіі ён разам з жонкай выгадаваў вялікіх вепрукоў. Прадаў іх і на выручаныя грошы купіў лес. На здымку дзед Макар стаіць на фоне сваёй хаты справа ў скураных чобатах побач са сваім аднавяскоўцам.

З часам Мартынчукі зноў наладзілі свой млын. І пачалі малоць муку. Дзед Макар жа да пенсіі працаваў конюхам у мясцовым калгасе. Я не раз з ім пасвіў коней. Там, у полі, дзядуся шмат расказваў мне пра вайну, пра несправядлівасць, самаахвярнасць і падтрымку, пра сваё першае каханне, пра кажух, які выйграў у карты і пасля ў тыя ж карты і прайграў... Я вельмі любіў яго слухаць.

Потым на пенсіі дзед Макар атрымліваў больш як 30 рублёў (для параўнання, бабулі плацілі толькі 10). А за кожны год грамадзянскай вайны яму прыпісалі тры працоўныя гады ў стаж.

**Міхась МАРТЫНЧУК**

■

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***